Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

За сталінскія КАДРЫ

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 16(202)
Субота
11
верасня
1954 г.

Цана 20 кап.

Юнакі і дзяўчаты! Настойліва авалодвайце ведамі і дасягненнямі перадавой сучаснай навукі і тэхнікі!

Актыўна ўдзельнічайце ў грамадскім жыцці універсітэта!

Уступайце ў навуковыя гурткі, калектывы мастацкай самадзейнасці, памнажайце спартыўную славу свайго універсітэта!

АКТЫВІЗАВАЦЬ НАВУКОВУЮ РАБОТУ СТУДЭНТАЎ

Мінулы навучальны год быў самым плённым у навукова-даследчай рабоце студэнтаў. На паседжаннях 65 гурткоў, якія працавалі пры ўсіх кафедрах, было прачытана і абмеркавана да 400 дакладаў. Большасць з іх рэкамендавана на пяты гарадскі агляд студэнцкіх навуковых работ. Як і раней, універсітэт заняў на аглядзе першае месца сярод вышэйшых навучальных устаноў Мінска.

Але ў рабоце СНТ універсітэта меліся і сур'ёзныя недахопы. Некаторыя студэнты дрэнна наведвалі паседжанні гурткоў, фармальна адносіліся да напісання дакладаў. У рабоце гурткоў амаль не ўдзельнічалі пяцікурснікі філалагічнага і гістарычнага факультэтаў, першакурснікі геолага-геаграфічнага факультэта. Фармальныя адносіны да кіраўніцтва навуковай работай студэнтаў з боку кафедраў фізмата і хімфака прывялі да таго, што гурткі гэтых факультэтаў былі адарваны ад практыкі.

Асноўны недахоп у навуковай рабоце студэнтаў—празмернае зацягванне арганізацыйнага перыяду. Кіраўнікі многіх гурткоў звычайна толькі ў канцы верасня пачынаюць распрацоўваць тэматыку для навуковых работ. А першыя арганізацыйныя паседжанні праводзяць у пачатку кастрычніка. І толькі яшчэ праз месяц чытаюцца першыя даклады.

У гэтым годзе навуковыя кіраўнікі гурткоў і кіраўнікі СНТ універсітэта павінны паклапаціцца, каб арганізацыйны перыяд быў скарочаны да мінімума. Да студэнтаў трэба тэрмінова давесці планы работы гурткоў, пазнаёміць іх з тэматыкай дакладаў. Кожны гурткавец зараз павінен ведаць, калі яму трэба прадстаўляць даклад рэцэнзенту, калі чытаць на паседжанні. Да работы ў гуртках патрэбна прыцягнуць як пяцікурснікаў, так і студэнтаў першых курсаў.

Кіраўнікі кафедраў абавязана прасачыць, каб гурткі працавалі ў адной пэўнай галіне навукі і распрацоўвалі частку праблемы, над якой працуе кафедра. Кожная тэма, над якой працуе студэнт, павінна быць звязанай з патрэбамі народнай гаспадаркі, з практыкай.

Сваім вопытам, сумленнымі адносінамі да працы кіраўнікі гурткоў павінны зацікавіць студэнтаў, прывіць ім любоў да навуковай работы, стварыць трывалыя калектывы маладых даследвальнікаў.

Навукова-даследчая работа дапаўняе вучэбны працэс і з'яўляецца важным сродкам выхавання студэнцкай моладзі. Тут выяўляюцца юнакі і дзяўчаты, схільныя да навуковай дзейнасці, здольныя рабіць цікавыя і карысныя даследаванні. Сённешнія гурткоўцы—гэта будучыя аспіранты, вучоныя. Таму навукова-даследчай рабоце студэнтаў патрэбна ўдзяліць як-мага больш увагі і распачаць яе не трацячы часу.

Па путёўках прафкома

Цікава і карысна правялі летнія канікулы студэнты нашага універсітэта. Многія з іх пабывалі ў санаторыях і дамах адпачынку, удзельнічалі ў турысцкіх паходах. Было выдадзена 20 путёвак у лепшыя санаторыі Крыма, Каўказа, Літвы. Сярод атрымаўшых путёўкі—студэнтка 4 курса біяфака Г. Лінская, студэнт 4 курса гістарычнага факультэта Ф. Барысевіч.

У дамах адпачынку пабывалі В. Зарэцкі (4 курс аддзялення журналістыкі), М. Корчыц (5 курс філфака), Д. Востраносава (4 курс хімфака) і многія другія. Гэтым летам 49 студэнтаў атрымалі путёўкі ў дамы адпачынку «Ждановічы», «Блонь», «Чонкі», «Зялёнаградск» і «Орша».

Студэнты Бахановіч (5 курс фізмата), Краўцова (5 курс хімфака), Харкевіч (4 курс аддзялення журналістыкі) правялі лета ў турысцкіх паходах на Ваенна-Сухумскай дарозе, на Крыму і Закаўказзю. Лепшы ў Совецкім Саюзе вучэбна-альпінісцкі лагер «Алібек» наведалі студэнты Сокалаў, Зайцава, Пятрэнка і другія—усяго 20 чалавек. У Ленінградзе і гістарычных месцах Ленінградскай вобласці пабывалі студэнты Невядомская, Уколаў і другія.

Б. МІЦКЕВІЧ,
старшыня аздараўленчай камісіі прафкома.

Агітбрыгада ў калгасах

Вестка аб прыездзе агітбрыгады гістарычнага факультэта ў калгас імя Кастрычніцкай рэволюцыі абляцела за гадзіну ўсе брыгады. Маладыя і старыя сабраліся ў сваім клубе адпачыць пасля працоўнага дня.

З вялікай цікавасцю праслухалі калгаснікі невялікую лекцыю «Паходжанне і класавая сутнасць рэлігіі», якую прачытаў студэнт 5 курса аддзялення філасофіі Антон Савасцюк. Пасля лекцыі студэнты паказалі хлебаробам п'есу А. П. Чэхава «Мядзведзь», прачыталі рад твораў Я. Коласа, беларускую народную паэму «Тарас на Парнасе».

Агітбрыгада правядзе ў калгасах Мінскага сельскага раёна 5 дзён. За гэты час яна выступіць у брыгадах калгасаў імя Суворава, імя Варашылава і других.

І. ПЯТРОВІЧ.

На універсітэцкім

ГУРТКІ ПАПАЎНЯЮЦЦА

Драматычны калектыў універсітэта карыстаецца заслужанай павагай не толькі сярод нашых студэнтаў і супрацоўнікаў, але і сярод працоўных горада. Сёлета драмкалектыў папоўніўся таленавітай моладдзю з першых курсаў. Зараз гурткоўцы пачалі працаваць над спектаклем па п'есе А. П. Чэхава «Вішнёвы сад». Намечана таксама аднавіць раней пастаўленыя спектаклі «На дне» М. Горкага і «Не называючы прозвішчаў» В. Мінко. Многія ролі будуць адноўлены новымі ўдзельнікамі драмкалектыва.

Значна папаўняюцца і іншыя гурткі мастацкай самадзейнасці універсітэта.

Упершыню ствараюцца гурткі салістаў-інструменталістаў, піяністаў, віяланчэлістаў, скрыпачоў і акардыяністаў.



Выйшаў першы нумар насценнай газеты „Слова філолага".
Фота В. ХЛІМАНАВА

У батанічным садзе

Батанічны сад нашага універсітэта налічвае звыш 800 відаў розных раслін і дрэў. У час летніх канікул сад наведвалі шматлікія экскурсіі студэнтаў-завочнікаў і школьнікаў горада Мінска. Для студэнтаў біёлага-глебавага факультэта тут сабраны рознастайныя гербарыі кветак, раслін, пладоў, насення.

Зараз у батанічным садзе рыхтуюцца матэрыялы для лабараторных работ студэнтаў чацвертых курсаў прыродазнаўчых факультэтаў, для ілюстрацыі курса сістэматыкі вышэйшых раслін. Хутка ў садзе пачнуць праводзіцца практычныя заняткі са студэнтамі-біёлагамі.

В. ПАЎЛОВІЧ.

НЯДЗЕЛЬНІК ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Нядаўна адбыўся нядзельнік студэнтаў першых курсаў. Каля 300 чалавек выязджала ў навакольныя калгасы, каб дапамагчы сельскім працаўнікам ва ўборцы багатага ўраджаю. Студэнты працавалі на ўборцы каноплі, на малацьбе збожжа. Калгаснікі шчыра і радасна прынялі сваіх сяброў.

Нядзельнік садзейнічаў згуртаванню першакурснікаў. Яны пазнаёміліся адзін з другім не толькі ў час заняткаў, але і ў працы.

Р. СЛАВІН.



Уступіў у строй новы інтэрнат па Бабруйскай вуліцы.
Фота І. ПЯТРОВІЧА

ДАПАМОГА КАЛГАСНІКАМ

Студэнты універсітэта ў парадку шэфскай дапамогі нядаўна выехалі ў калгасы Мінскага раёна. Яны дапамогуць працаўнікам вёскі ў сціслыя тэрміны ўбраць багаты ўраджай бульбы, вырашчаны на калгасных палях. Разам з тым, студэнты правядуць сярод хлебаробаў шэраг культурна-масавых мерапрыемстваў: прачытаюць даклады на рознастайныя тэмы, пакажуць выступленні мастацкай самадзейнасці.

НОВЫЯ КАМПЛЕКТЫ ІНСТРУМЕНТАЎ

Значная ўвага надаецца развіццю мастацкай самадзейнасці сярод студэнтаў нашага універсітэта. Падабраны вопытныя кіраўнікі гурткоў. Закуплены новыя інструменты для духавога аркестра. Зараз духавы аркестр мае трыццаць інструментаў, што дасць магчымасць павялічыць колькасць музыкантаў у аркестры. Новы камплект інструментаў атрыман нядаўна і для домра-балалаечнага аркестра. У хуткім часе прыбудуць баяны і акардыёны.

РАДЫЁФІКАЦЫЯ УНІВЕРСІТЭТА

Ва універсітэце сіламі студэнтаў фізіка-матэматычнага факультэта абсталёўваецца радыёвузел. Будуць радыёфікаваны ўсе вучэбныя карпусы і новыя студэнцкія інтэрнаты. Рэктарат універсітэта асігнаваў на будаўніцтва радыёвузла 15 тысяч рублёў.

КОМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

ГРУПА—ЦЭНТР КОМСАМОЛЬСКАЙ РАБОТЫ

Комсамольская група—самая малая ячэйка многамільённага саюза моладзі. Вартасць яе заключаецца ў тым, што члены групы заўсёды разам: вучацца, працуюць, адначы ваюць. Гэта дае магчымасць выявіць характар, звычаі, схільнасці чалавека і ў адпаведнасці з гэтым уздзейнічаць на яго.

Як-жа працавала наша група ў мінулым навучальным годзе?

Аб гэтым я і хачу расказаць.

ПАМЫЛКА ВАЦЛАВА МАЦКЕВІЧА

Сіла групы—у яе згуртаванасці. Гэта ў многім залежыць ад таго, як працуе комсамольскае бюро групы і яго сакратар.

Вацлаву Мацкевічу, нашаму сакратару, ніхто-б не зрабіў дакору ў нежаданні працаваць. За справу ён хварэе ўсёй душой. Вацлаў глыбока зразумеў тую адказнасць, якая кладзецца на яго, як важака моладзі. Апрача яго ў комсамольскае бюро курса ўваходзілі Аня Калініна і Сяргей Шчэрба. На першым паседжанні яны размеркавалі абавязкі.

— Будзем працаваць,—сказаў ім Вацлаў, і яны згадзіліся.

Аднак працаваць ім не хацелася, а Вацлаў аказаўся не такім патрабавальным, каб прымусіць іх працаваць з аганьком, па-комсамольску Дае, напрыклад, ён даручэнне Сяргею. Той не адмаўляецца, але праходзіць дзень—два, а справа з месца не кранаецца. Уздыхае Вацлаў і сам бярэцца за выкананне свайго даручэння. З Аняй такія выпадкі здараліся яшчэ часцей. Вось такое становішча і прывяло да таго, што Вацлаў зусім перастаў даваць даручэнні членам бюро і рабіў за іх сам. Ён толькі прасіў Аню і Сяргея: «Вы хоць на бюро прыходзьце рэгулярна...»

Але і на бюро таксама яны не заўсёды прыходзілі. Вацлаў нават і не думаў дасканала выявіць, чаму той альбо іншы член бюро адсутнічаў на паседжанні. Яму вельмі хацелася, каб наш курс не меў дрэннай рэпутацыі. Пахвальнае жаданне! Але зноў Мацкевіч зразумеў гэта па-свойму. Замест таго, каб прызваць да дзеяння ўвесь калектыў, умела спалучыць яго сілы, ён імкнуўся сам выправіць тыя альбо іншыя прабелы, замазаць шчыліны ў справе выхавання моладзі.

Рэдактар насценнай газеты Нікалай Васілеўскі скардзіцца:

— Не атрымоўваецца ў нас штосьці з газетаю...

— Не ўмееце,—гаворыць Вацлаў, і сам бярэцца за выпуск газеты. А ў гэты час шэсць членаў рэдкалегіі бяздзейнічаюць альбо праглядаюць новыя кінофільмы.

Патрэбна выставіць на спаборніцтвы спартыўную каманду. Вацлаў вырашае, што карысці з Хлынцава, як фізорга групы, не будзе, і сам выяўляе, хто і якім відам спорту займаецца, сам рыхтуе спіскі спартсменаў.

Трэба падрыхтаваць даклад для падшэфнага дзіцячага дома—Вацлаў спыняе свой выбар на Аляксандру Яцкевічу. Але той па горла заняты, і ён даручае даклад Ларысе Краснеўскай. Ларыса ўпершыню сустракаецца з гэтай справай і патрабуе дапамогі, але дапамагчы няма каму.

Такіх прыкладаў багата. Чаму? Таму, што комсамольскае бюро працуе без плана. Усё робіцца нахаду. Няправільна падышоў Мацкевіч і да размеркавання грамадскіх абавязкаў. Напрыклад, Вацлаў шукае падыходзячую кандытатуру:

«Не справіцца»—думае ён аб адным, «нельга яму давяраць»—разважае пра другога. І ў выніку Тамара Длугашэўская, Эрнст Калядзенка атрымоўваюць па тры даручэнні; Нэла Кавалёва, Рэм Ткачук—па два. Астатнія студэнты не маюць ніводнага даручэння.

Што-ж выходзіць?

Спасылаючыся на мноства нагрузак і даручэнняў, Нэла, Тамара і другія альбо не выконваюць ніводнай з іх, альбо перакладаюць на плечы самога сакратара бюро. Той пакорліва згаджаецца: ім цяжка

БЮРО Ў БАКУ

Вацлаў толькі нядаўна стаў комсамольскім актывістам. Яму патрэбна штодзённая дапамога. Як групорг, ён больш чым другі актывіст мае патрэбу ў дапамозе. А гэтага якраз і не аказала яму комсамольскае бюро аддзялення журналістыкі на чале з Наўлам Ткачовым. Каму, як не яму, патрэбна было-б рабіць нарады па абмену вопытам работы комсамольскіх актывістаў? І няхай Павел задумаецца над пытаннем, як можна працаваць групоргу, калі ён не ведае сваіх задач. Вацлаву ніхто не растлумачваў іх. У пачатку года спрабавалі правесці такую нараду, але яе было мала. Даклады былі пабудаваны з агульных фраз, самага галоўнага—аналіза работы груп—не было. І хіба-ж можна было заўважыць нявопытнаму работніку, што ў яго рабоце добрага і што дрэннага?

Наша бюро паверыла словам Вацлава, што на курсе ўсё добра. І як не паверыць: насценгазета выходзіць, зрэдку наладжваюцца культпаходы, вядзецца шэфская работа, на факультэце наш курс не на апошнім месцы. Што-ж яшчэ патрабуецца, каб ажывіць работу нашай комсамольскай арганізацыі? А патрабуецца многае.

Па-першае, рэдакцыя павінна сачыць за дзейнасцю друкуемых у сваёй газеце матэрыялаў, наладзіць іх абмеркаванне на курсе. Далей, чаму ў нас у культпаходах удзельнічае не больш трэці людзей? Чаму шэфская работа ў дзіцячым доме абмяжоўваецца толькі зборам бібліятэчкі?

Ткачоў і ўсе члены бюро палічылі, што Вацлаў «здольны кіраўнік», і нават ні разу не спыталі ў яго аб плане работы. Калі на курсе здаралася што-небудзь незвычайнае, бюро гублялася:

— Як гэта здарылася? Здаецца ў вас і работа вядзецца не дрэнна...

Вось чаму да гэтага часу на нашым курсе няма сапраўднай комсамольскай работы.

А. ГЕРУС,
студэнт 2-га курса аддз. журналістыкі.

Настойліва авалодваць сваёй прафесіяй

Наступіў новы навучальны год. Тысячы студэнтаў запоўнілі прыветныя аудыторыі вышэйшых навучальных устаноў. Гасцінна сустрэлі новае папаўненне старэйшыя таварышы, прафесарска-выкладчыцкі састаў універсітэта.

У гэтыя дні хочацца звярнуцца да сваіх сябраў, такіх-жа першакурснікаў, як і я, што паступілі сёлета ва універсітэт, паказаць, што месцам, якое прадаставіла ім маці-радзіма, патрэбна даражыць і ганарыцца.

Вайна не дала мне, як і многім другім юнакам і дзяўчатам, магчымасці працягваць вучобу. У 1944 годзе я з трыма сваімі сябрамі дабраахвотна ўступіў у рады Совецкай Арміі.

Аднойчы, калі нашы войскі ўжо дабівалі ворага на вуліцах Берліна, я сказаў таварышам, маладым воінам:

— Адну справу мы ўжо зрабілі—паставілі свае прозвішчы на сценах рэйхстага. Цяпер патрэбна ўзнавіць усё разбуранае вайной. А галоўнае—усім вучыцца.

Радасна сустрэлі нас родныя мясціны. Нават украінскія вербы, і тыя шумелі сваім лісцем больш ветліва, чым раней.

Звярнуўшыся дадому, я ўдзельнічаў ва ўзнаўленні разбуранай вайною гаспадаркі. Спачатку працаваў у рэдакцыі радыёвяшчання, потым — у рэдакцыі раённай газеты. Гэтая работа пашырыла мой далягляд, дала мне шмат новага, карыснага. Але выказаная раней, у жарце, думка не давала спакою, не забывалася, а станавілася ўсё больш моцнай і акрэсленай. І я паступіў у школу рабочай моладзі. Мне гаварылі:

— Кінь вучобу. Ты-ж спіш толькі па 3—4 гадзіны ў суткі.

Гэта было так. У гадзіну ночы прыдзеш са школы і да 4—5 гадзін рыхтуеш урокі. А ў 9 зноў на работу. Але я паступова, са ступенькі на ступеньку, падымаўся ўсё вышэй і вышэй. І вось у руках у мяне атэстат сталасці. Куды цяпер? Стаць журналістам—мая даўняя мара. Яна ўзнікла яшчэ ў першыя дні работы ў рэдакцыі. Я разумеў, як многа карыснага дае газета партыі, грамадству. Мне хацелася так сама ўнесці і сваю долю працы ў справу комуністычнага выхавання працоўных.

Нарэшце мая мара здзейснілася. Я студэнт аддзялення журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Гэта магчыма толькі ў нашай краіне, дзе моладзі шырока адчынены дзверы ў навуку, у жыццё, у цудоўнае будучае. Дык адкажам-жа, дарагія сябры, на бацькоўскія клопаты Партыі і Урада аб маладым пакаленні выдатнай вучобай, з першых дзён будзем настойліва авалодваць сваёй прафесіяй!

В. ДРАГУНОЎ,
студэнт 1-га курса аддз. журналістыкі.

Экскурсіі ў заалагічны музей

Учора ў заалагічным музеі універсітэта пабывала група экскурсантаў—школьнікаў Забалоцкай сямігадовай школы Любанскага раёна. З цікавасцю разглядалі шматлікія экспанаты выдатнікі вучобы Зіна Пархімовіч, Ніна Смоляр, Валя Трухан і другія вучні.

За летнія месяцы заалагічны музей наведала больш 50 экскурсій. У ім пабывалі рабочыя мінскіх прадпрыемстваў: трактарнага, мотавеласіпеднага заводаў, абутковай фабрыкі імя Кагановіча, настаўнікі і вучні Мінска, Бабруйска, Літоўскай і Эстонскай ССР, рада сельскіх раёнаў Беларусі.

Можна было-б працаваць лепш

Нашы студэнты выпрацавалі добрую традыцыю—працаваць у час летніх канікул па добраўпарадкаванню універсітэта і інтэрнатаў. Не лішне сказаць, што заўсёды дапамога студэнтаў была шчырай і бескарыслівай. Студэнцкія работы ўжо вылічваюцца ў сотнях тысяч рублёў Залетась на будаўніцтве інтэрната па вуліцы Свердлова студэнты выканалі земляных работ на сорак тысяч рублёў, сёлета—удвая больш. Неаднаразова наладжваемыя прафкомам і камітэтам комсамола нядзельнікі мелі сваё дадатнае значэнне. Добра папрацавалі студэнты і гэтым летам. Студэнты Шумскі (2 курс фізмата), Юр'ева і Чувікава (4 курс аддзялення журналістыкі), Пашкевіч (3 курс філфака), Пармон (2 курс біяфака) і многія другія, якія працавалі ў першай змене, паказвалі прыклад свядомых і самаадданых адносін да працы. Справа ў іх заўсёды спорылася, працавалі яны з аганьком, з комсамольскім задорам. Будаўнікі інтэрнатаў з цеплынёй гавораць аб гэтых студэнтах. Брыгадзіры першай змены тт. Якавенка, Пісарэнка, Гадуноў, Глушанаў і Сычова не толькі ўмела кіравалі работай студэнтаў, але і самі добра працавалі

Аднак ўжо за гэтымі першымі поспехамі крыліся вялікія недахопы. Прафком і камітэт комсамола па меры набліжэння верасня зніжалі творчую актыўнасць, а разам з тым зніжалася працоўная дысцыпліна і на будаўнічых пляцоўках сярод студэнтаў. Ужо ў другой змене на работу не прышла амаль палавіна студэнтаў. Не была даведзена да кожнага студэнта норма выпрацоўкі, што шкодна адбілася на выкананні графіка. Ды і наогул, графік будаўнічых работ не правяраўся (па віне будаўнікоў).

Знайшліся і такія студэнты, якія прыходзілі на аб'екты толькі для таго, каб перашкодзіць працаваць астатнім. Студэнтка 2 курса хімічнага факультэта Ліўшыц з'яўлялася на работу з кнігай, з якой не разлучалася ўвесь дзень. З пагардай адносячыся да свайго абавязку, яна за чатыры дні, праведзеныя на будаўніцтве інтэрната, не выканала нават адной дзённай нормы. Студэнт другога курса аддзялення фізікі Неменман вёў сябе на аб'ектах настолькі абураюча, што яго паводзіны сталі прадметам абмеркавання ў групе. А студэнты Цярэнцева, Рыхоўская (хімфак) і некаторыя другія не лічыліся з указаннямі кіраўнікоў будаўніцтва, самавольна накідалі працу ў любы час дня.

Што датычыць трэцяй і чацвёртай змен, то тут справы абстаялі яшчэ горш. Не вышла на работу большая палавіна студэнтаў. Але і тая меншасць, якая калі-ні-калі прыходзіла на будаўнічыя пляцоўкі, працавала з рук вон дрэнна. Былі і такія «жартаўнікі», якія сваімі забавамі расхаладжвалі сумленна працуючых студэнтаў. Набіраючы на ноўрыдлёўкі зямлі, яны, прагінаючыся, насілі іх за некалькі дзесяткаў метраў. Усё гэта суправаджалася смехам такіх-жа гультаёў. Караткевіч, Калінін, Красоўская паказалі сябе не толькі нядбайнымі работнікамі, яны аказалі дрэнны ўплыў і на астатніх студэнтаў. Безумоўна, за такія абураючыя факты нерадзівыя студэнты павінны быць прыцягнуты да комсамольскай адказнасці. Акрамя таго, іх патрэбна прымусіць занава адпрацаваць на будаўніцтве інтэрната свой тэрмін.

Асаблівай увагі заслугоўваюць тыя студэнты, якія зусім не працавалі на будаўніцтве. А такіх наліч-

ваецца больш трохсот. Нягледзячы на прайшоўшы тыдзень з пачатку заняткаў, прафком не высветліў прычын нявыхаду на работу гэтых студэнтаў. Усё-ж нельга дапусціць, каб за два месяцы летніх канікул студэнт не мог выбраць адзін тыдзень, каб выканаць свой студэнцкі абавязак. Вядома, што тт. Гусман (4 курс аддзялення матэматыкі), Ураваў (3 курс гістфака), Васілеўскі (4 курс гістфака), Перэльман (4 курс аддзялення фізікі) не з'явіліся на работу не з прычыны якіх-небудзь важных акалічнасцей, а проста па нежаданню. Студэнцкая грамадскасць спадзяецца, што гэтыя і другія студэнты, не адпрацаваўшыя свой тэрмін на будаўніцтве, не пазбегнуць увагі камітэта комсамола і прафкома.

Было шэраг і іншых прычын, якія перашкаджалі хуткаму заканчэнню будаўніцтва інтэрнатаў. Па віне кіраўнікоў будаўніцтва студэнтам даводзілася па некалькі разоў выконваць адну і тую-ж работу (мыццё акон, падлогі, чыстка радыятараў). З-за гэтага прапала дарэмна не мала студэнцкай працы. Нельга прайсці і міма такога факта, як адсутнасць адзінаначалля на будоўлях. Розныя начальнікі па дзесяць разоў на дзень пераводзілі студэнтаў з адной работы на другую, трацячы дарагі час.

Выклікае здзіўленне бесклапотнасць да лёсу інтэрнатаў адміністратыўна-гаспадарчай часткі універсітэта, якая ператварылася ў безгаспадарчую частку. На патрэбы будаўнікоў інжынер т. Жалковіч і т. Бярэзін звычайна адказвалі:

— Мы нічога дапамагчы не можам,—і ўходзілі з аб'ектаў.

Безадказна аднеслася да выпуску «баявога лістка» на аб'ектах прызначаная камітэтам комсамола рэдкалегія. Вышаў толькі адзін нумар лістка, і то выпускам яго кіраваў больш старшыня прафкома т. Кахновіч, чым рэдактар—студэнт аддзялення журналістыкі Ткачук. А члены рэдкалегіі студэнты 4 курса аддзялення журналістыкі В. Чаргейка і М. Варчэня за лета нават не пабывалі на будоўлях. Мастакі Кійранен і Чуркін «дапамаглі» выпуску баявога лістка толькі абяцаннем.

У застаўшыяся дні да пуска ў эксплаатацыю інтэрната «Б» прафком і камітэт комсамола павінны арганізаваць новую дапамогу будаўнікам, наладзіць суботнікі, нядзельнікі. Кожны студэнт павінен адпрацаваць свой тэрмін!

Э. ЮР'ЕЎ.

ПЕРШАЯ ПРАКТЫКА

Летам гэтага года студэнты нашага курса праходзілі першую геалагічную практыку. Мы наведалі Віцебскую і Смаленскую вобласці і азнаёміліся там з геалагічнай будовай мясцовасці. Першыя дні вывучалі берагі Заходняй Дзвіны, дзе на паверхню глебы выходзяць магутныя пласты даламітызаваных вапнякоў і даламітаў, пакрытых тоўшчай чацвярцічных адкладанняў. Уся група была разбіта на 8 брыгад, кожная з якіх вырашала сваю задачу.

На Смаленшчыне будучыя геолагі сабралі да 400 узораў глебы.

Даследаванні былі зроблены таксама ў Новай Баяршчыне на рацэ Касплі.

Практыка дала нам першыя навыкі работы ў полі.

Э. ЛЕЎКОЎ,
студэнт другога курса аддз. геалогіі.



Галоўны Каўказскі хрыбет.
***Фота А. БАНДАРЧУК** (са здымкаў, дасланых на конкурс).*

А. ХАРКЕВИЧ.

ВРЕМЕНА ГОДА

I.

Роняла **осень** золото,
пылал костёр-рассвет,
когда ввалилась молодость
к нам в университет.

Вихрастая, весёлая
пришла,
смеясь, звеня,—
дохнуло детством, школою
внезапно на меня.

Не раз прошёлся мимо я,
девчат взяв на прицел,—
и всё ж,
моя любимая,
тебя не рассмотрел.

Не снилось, не гадалося,
не думалося мне,
что это ты смеялася
с подругой в стороне!

Что эта радость звонкая—
ты и была сама,
что эти ружи тонкие
сведут меня с ума...

II.

Зима рукою белою
стелила снежный шёлк,
когда к тебе несмело я
впервые подошёл.

— Как вас зовут, красавица?—
попал: не в глаз, а в бровь.

...И это называется
«взаимная любовь»!—
ушла,
улыбку спрятала...

А я стоял, стоял.
Ни в чём не виноватую
в руках фуражку мял.

Смеялись первокурсницы—
прослышал я потом:
мол,
быть бы ему в кузнице,
верзиле, кузнецом!

А снег—то манной сеялся,
то падал, как кристал.
...На что-то я надеялся,
чего-то ожидал...

III.

Несла **весна** подснежники,
рассыпала вдоль сёл,
когда меня у вешалки
с тобою случай свёл.

С твоей рукой в сообществе
легла моя рука,—
и взяла гардеробщица
два наших номерка.

Стоим.
Молчим.
Украдкою
друг на друга глядим.
Свиданье, хоть и краткое,
но нравится двоим.

А вот и гардеробщица
несёт моё пальто!
Надел.
Подкладка—морщится,
в плечах—совсем не то...

Но ты не в силах более
в ресницах прятать взгляд:
— Вы, кажется, изволили
надеть не свой наряд?!

IV.

Дышало **лето** красное
прохладою в тени.
Нет, видно не напрасно я
любовь к тебе хранил!

Хотя и недосказанным
остался разговор,
я чувствую, что связаны
сердца наши с тех пор.

Немало было промахов,
но я экзамен сдал:
когда цвела черёмуха
тебя поцеловал!

Задуманное—сбудется,
мы молоды вдвоём,
как молода та улица,
которою идём.

Нам на роду написано
не стариться сейчас.
А любят—
даже с лысиной
товарищи—
у нас!

НАШ КАЛЯНДАР

ДА 25-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ П. ТРУСА

ВЕЧНА МАЛАДЫ

Перада мною невялікая кніжка вершаў і паэм. Прыгожы юнак задуменна ўглядаецца ўдалячынь. Гэта—Паўлюк Трус.

Паэт-комсамолец, паэт-барацьбіт, ён пакінуў у беларускай літаратуры непаўторныя старонкі цудоўнай паэзіі, аддаў усё сваё жыццё вялікай справе соцыялізма.

І аб чым-бы ні пісаў малады паэт: аб панскім прымусе ці аб новым жыцці, аб смерці героя ці аб шчасці кахання—яго творы хвалююць сваёй непадкупнай цеплынёй і глыбокай задушэўнасцю.

Яшчэ студэнтам педтэхнікума, а потым і нашага універсітэта Паўлюк Трус гнеўна выкрывае кулакоў, папоў, ксяндзоў і іх пасобнікаў, ва ўвесь голас услаўляе ўсё новае, перадавое.

З нашага жыцця паэт адбіраў самыя істотныя, самыя хвалюючыя моманты.

Вось маці развітваецца са сваім малодшым сынам Янкам, які ідзе ў партызаны. Яна перажывае за сына, яе хвалюе доўгае расставанне, але яна цвёрда ўпэўнена ў перамогу. Так пачынаецца паэма «Юны змаганец», цікавая сваёй глыбокай сардэчнасцю і сапраўды народнай прастатой.

Перагортваю старонку—паэма «Астрожнік». Яна пабудавана на ўнутраных перажываннях героя. Сіла паэмы, яе вартасць—у праўдзівым адлюстраванні савецкага патрыятызма. І якой цеплынёй, якой шчырай праўдзівасцю сагрэта паэма!

Паказваючы вясковую актывістку, маладую дзяўчыну, паэт знаходзіць самыя трапныя, самыя цёплыя словы:

Ты ўся жыла.
Ліліся словы;
Як лебедзь,
плавала рука
Ты захаплялася
прамовай,
Лістком-аднаснікам
ЦК.
Ты гаварыла

аб комуне,
Аб тым, як жыць,
як будаваць...
(верш «Дзяўчыне»).

Самыя светлыя мары свае паэт уклаў у паэму «Дзесяты падмурак», якая прысвечана-дзесяцігоддзю стварання Совецкай Беларусі. Гэтая лебядзіная песня з'яўляецца сонечнай вяршыняй мастацкай творчасці паэта, да якой ён падняўся за кароткія пяць год сваёй літаратурнай дзейнасці.

Перад вачыма, як сон, праходзіць дзікае мінулае. Крокі сірат і ўдоў, што вымушаны хадзіць з торбай, балюча кладуцца на маё сэрца, калі я чытаю паэму:

Разышліся пад гарою
тры дарогі ў полі.
Па якой-жа—
тая доля,
Па якой—
нядоля?..
Не каліна над вадою
пахіліла голле,—
Плача маці сярод поля,
праклінае долю.

Затое як натхнёна малюе паэт велічныя дні нашага жыцця, гады ўпартага змагання і перамог. Простыя радкі хвалююча расказваюць, як горача любіў ён сваю Радзіму. Яго запаветнай марай было ўбачыць родную Беларусь краінай фабрык і заводаў, краінай магутнай тэхнікі. Хіба можна забыць такія непаўторныя радкі, дзе ў кожным слове, у кожным вобразе чуецца рэха родных палёў і лясоў, дзе кожная думка пранізана дыханнем вясны і маладосці:

Край легенд,
адвечных песень-казак,
Край паэм—
бальзам жывых крыніц...
Край балот,
тугі азёраў наскіх,
Край цішы
і громаў—навальніц...
Край палёў...
О, край,—
калі-ж ты станеш
Краем фабрык дымных
і машын?..

Дзе знайсці ў беларускай літаратуры лепшы паэтычны малюнак зімы, якім пачынаецца паэма «Дзесяты падмурак»!

Падаюць сняжынкі—
дыяменты росы,
Падаюць бялюткі
за маім акном...
Расчасалі вішні
шоўкавыя косы
І ўранілі долу
снегавы вянок.
Дзесьці ў прасторах
празвінелі бомы.
Дацвілі пялёсткі
нейчае тугі...

або:

Зноў зіма паслала
снежныя кілімы,
Зажурыла беллю
паплавы, лугі,
І прыходзіць радасць
у красе маўклівай.
Адплываюць хвалі
смутку і тугі...»

Я загортваю кнігу, а думкі адна за другой праносяцца ў маёй галаве: «Паэт-комсамолец, ты асабліва блізкі мне сваімі думамі, сваімі пачуццямі, бо ў тваіх песнях—наша маладосць!»

Г. МОХАРТ.

ПЯСНЯР ВЯСНЫ І МАЛАДОСЦІ

Паўлюк Трус—паэт вясны і маладосці—захапляе нас, совецкую моладзь, сілаю свайго паэтычнага таленту, сваёй ідэйнасцю і пачуццём бязмежнай адданасці роднай краіне і народу. Навізна формы, глыбокая эмацыянальнасць і цёплае пачуццё пранізваюць кожны верш і кожную паэму гэтага своеасаблівага песняра беларускага народа.

Паўлюка Труса я палюбіў ужо ў школьныя гады. Яго хвалюючыя творы заставілі мяне яшчэ больш уважліва прыгледзецца да навакольля, яшчэ мацней палюбіць велічную прыроду маёй радзімы, у якую так палка быў закаханы паэт.

Лепшыя творы паэта, як «Дзесяты падмурак», «Астрожнік», «Юны змаганец», яго лірычныя вершы і зараз не страцілі свайго хараства, злобадзённасці, да гэтага часу хвалююць нас высокай дасканаласцю мастацкай формы, пачуццём новага ў жыцці.

Паэзія П. Труса назаўсёды ўвойдзе ў скарбніцу выдатных твораў нашай совецкай эпохі.

В. ЛАЗОЎСКІ,
ст. 4-га курса аддз. беларускай мовы і літаратуры.

НА РАДЗІМЕ ПАЭТА

Глухім і закінутым быў калісьці гэты край. Цемень і нястача былі спадарожнікамі чалавека. І толькі совецкая ўлада прынесла багацце і культуру ў гэты куток Беларусі.

...Мы ідзем па вёсцы Нізок, радзіме паэта. З кожнай хаты нясуцца песні Масквы, Мінска, песні, якія горача любіў паэт-комсамолец. Новым, культурным жыццём жыве сягоння радзіма паэта. Радыё, электрычнасць шырока ўвайшлі ў быт працаўнікоў калгаснай вёскі.

— Вера Адамаўна,—просім мы сястру Паўлюка Труса,—раскажыце нам пра жыццё і дзяцінства вашага брата.

Мы сядзім ва ўтульным пакоі, і Вера Адамаўна, ужо немаладая, але яшчэ даволі моцная і статная жанчына, расказвае пра рана абарваўшаеся жыццё любімага ўсімі паэта.

— Вось каб жыў Паўлюк, як бы ён радаваўся, гледзячы на родную вёску,—уздыхнуўшы, заканчвае яна.

Сапраўды, далёка разнеслася слава пра вёску Нізок, Уздзенскага раёна. З яе выйшлі два пісьменнікі—Кандрат Крапіва і Паўлюк Трус.

А вось былыя беднякі—браты Сцяпан, Міхась і Пятрусь Герасімовічы. Змалку цягнулі яны лямку паднявольнай працы. Толькі совецкая ўлада шырока расчыніла дзверы ў будучыню перад імі і іх дзяцьмі. З іх сямейства за гады совецкай улады выйшлі: падпалкоўнік медыцынскай службы, ветэрынар, дацэнт фізіялогіі, два аграномы, два лётчыкі, настаўніца. Дзеці калгаснікаў вучацца ў вышэйшых навучальных установах краіны.

...У адзінаццаць гадзін вечара мы выйшлі ад Веры Адамаўны і прайшліся па вуліцы. Над галавой распасцерлася мільярдамі зорак ціхае вячэрняе неба. Толькі за Вусой, з лугоў раз-па-раз падавала голас нейкая начная птушка. Вёска яшчэ не спала. Мы паволі крочылі па асветленай электрычнымі лямпачкамі вуліцы і з прыемнасцю ўдыхалі свежае паветра. На прызбах, на лаўках сядзела моладзь, і далёка разносіліся яе звонкія маладыя галасы. Здавалася, гэта пелі сэрцы, удосталь напоеныя свежасцю юнацтва, шчасцем жыцця. І бясконца хораша станавілася на душы ад усяго таго, што акружала нас.

А. РЫБАК.
(Насценгазета «Слова філолага»).

Універсітэцкі вожык



КЛОП

Салодкі пасляабедзенны сон парушае рэзкі стук у дзверы. У пакой уваходзіць камендант інтэрната на вул. Свердлова тав. Ткачук і дзве дзяўчыны ў брудных халатах, з поўметровымі пульверызатарамі ў руках.

— Клапы ёсць?—спыталі яны.

— Ёсць, ёсць!—узбуджана гаркнулі мы.

Хутка кожны з нас атрымаў над сяннік па жмені «дусту». Дзяўчаты са смехам накіравалі джала пульверызатара ў цэнтр геаграфічнай карты, што вісела над ложкам Нікалая Ярмашэвіча, потым яшчэ некуды, на сярэдзіну сцяны... На нядаўна куплены хлеб, раскрытыя канспекты, на толькі што вымытую тэніску паволі асядаў бялявы з'едлівы пыл.

— Тут, чаго добрага, задушышся замест клапа!—змрочна заўважыў Леанід Глебка. Ён доўга чысціў свой новы касцюм...

— Але затое спаць будзем спакойна,—адказалі аптымісты.

Назаўтра я прачнуўся першым і накіраваў позірк на столь. Там паранейшаму шпацыравалі пузаценькія паразіты.

— Хлопцы, паветраная трывога! Зараз будзе дэсант карычневаскурых парашутыстаў!—папярэдзіў я таварышаў.

— Напэўна, ізноў далі нам нізкаякасны «дуст»: «вагой пабольш, цаною патаней»,—скептычна растлумачыў Генадзій Зотаў. І ў доказ гэтага ён нагроб на сенніку прыгаршчы белага парашку, усыпаў яго ў паперу, асцярожна пасадзіў туды злоўленага клопіка—і завязаў.

Праз тры дні мы ўсе застылі ва ўрачыстым маўчанні ля папяровага пакуначка: з надзеяй чакалі вынікаў даследавання. Права развязаць нітку прадастаўлялася Зотаву.

— Жыве...—прашаптаў ён.

— Жыве!—панура падцвердзілі мы.

І сапраўды: насякомае, лежачы дагары, жвавенька рухала ножкамі.

Мы больш не спадзяваліся на дзяўчат з санэпідстанцыі Вечарам на дзвярах з'явіўся лозунг: «Забі клапа, бо ён укусіць цябе». Віталій Чаргейка ўзлез на тумбачку, запаліў запалку і тыцнуў яе ў адну са шматлікіх на столі шчылін. Усе астатнія былі напагатове і, хто чым мог, трушчылі клопікаў, якія паспешліва ратаваліся ад «пажару».

Вядома, і такія метады «паляванння» былі мала эфектыўнымі. Прыходзілі да нас тыя-ж самыя дзяўчаты яшчэ некалькі разоў, але іх візіты, апрача плям на сценах, нічога нам не далі.

Такое-ж становішча, як у 103-ім пакоі,—амаль ва ўсіх пакоях трэцяга і чацвертага паверхаў інтэрната па вуліцы Свердлова. У 80-ым пакоі гэты факт лаканічна зафіксаван аршыннымі літарамі на сцяне: «Клапы!!!». А побач—з дзесятак красамоўных карычневых плямак.

Безумоўна, насякомым жывецца вельмі прывольна: за апошні час ніхто не назіраў за санітарным становішчам пакояў, санкамісіі перасталі працаваць яшчэ з сакавіка, падлогі мыюцца ад выпадку да выпадку. Чаму-ж ім не жыць...

Студэнты неаднаразова гаварылі аб усім гэтым у прафкоме. Прафком у сваю чаргу напамінаў прарэктару па адміністратыўна-гаспадарчай частцы тав. Бярэзіну, што патрэбна прыняць меры і летам зрабіць газавую дэзінфекцыю. Але далей слоў справы не пайшлі.

В. Маякоўскі ў камедыі «Клоп» апісаў, як у 1979 годзе вучоныя са здзіўленнем разглядваюць адзіны экзэмпляр «клопуса нарваліса», які папаў туды з далёкага мінулага. Нашы гаспадарчыя дзеячы, відаць, змагаюцца за чэсць, каб гэты клоп быў іменна з інтэрната па вуліцы Свердлова.

А. МАЛЬДЗІС.

ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ...

Што намечаны на першы семестр 1954—55 навучальнага года план калітыка-выхаваўчай і культурна-масавай работы сярод студэнтаў універсітэта поўнасцю перадрукаван з такога-ж плана за 1953 год за выключэннем нёкаторых календарных дат. Адказнасць за многія мерапрыемствы ўскладзена на былога прарэктара па адміністратыўна-гаспадарчай частцы т. Зюбу, які больш года ўжо не працуе ва універсітэце.

* * *

Што праўленне клуба нашага універсітэта намеціла правесці ў летні перыяд для будаўнікоў студэнцкіх інтэрнатаў каля пяцідзесяці розных культурна-масавых мерапрыемстваў, а правяло ўсяго... чатыры.

* * *

Што з маючыхся ва універсітэце двух з паловай тысяч крэслаў штогод рамантуецца больш двух тысяч і на гэта расходуецца 35—40 тысяч рублёў.

* * *

Што аранжэрэю універсітэта намецілі адрамантаваць вясной. З 31 ліпеня пачалі ставіць рыштаванні. А праз месяц яны разбурыліся. На гэтым і была пастаўлена кропка дзейнасці нашых гаспадарнікаў.

* * *

Што ў 23-ім пакоі інтэрната па Бабруйскай вуліцы (корпус «А»), у якім жыве 10 студэнтаў, няма ніводнага стула, ніводнай тумбачкі, няма рэпрадуктара, ваконных занавесак і іншага абсталявання.

Надобнае становішча і ў астатніх пакоях.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ

ЗА ДАЛЕЙШЫ ЎЗДЫМ СПАРТЫЎНАГА МАЙСТЭРСТВА

У мінулым навучальным годзе фізкультурны калектыў нашага універсітэта заняў першае месца па пастаноўцы спартыўна-масавай работы сярод вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, якія ўваходзяць у таварыства «Навука». За год ва універсітэце было праведзена да 22 розных спартыўных спаборніцтваў. Нашы спартсмены ўдзельнічалі ў 25 спаборніцтвах гарадскога і рэспубліканскага маштабаў. У пяршынстве Рэспубліканскага совета ДСТ «Навука» яны заваявалі першыя месцы па лёгкай атлетыцы, гімнастыцы, плаванню, стральбе, баскетболу. Вялікая колькасць прызавых месцаў заваявана камандамі універсітэта ў пяршынстве ВНУ горада Мінска. На працягу года нашы вядучыя спартсмены абнавілі амаль усе рэкорды універсітэта па плаванню, каньках, лёгкай атлетыцы і стральбе; лепшыя спартсмены, як Анкуда, Гарохава, Свідэрская, уваходзяць у зборныя каманды Беларусі па баскетболу, Ройзман—па шахматах. Бразоўская, Шацер, Пракопчык, Кучар, Холкіна, Паўлючэнка, Брэйва, Клебановіч і другія ўваходзяць у зборныя каманды Белсовета ДСТ «Навука» па розных відах спорту. Радасна адзначыць, што многія студэнты універсітэта ўнеслі папраўкі ў рэкорды Белсовета таварыства «Навука».

Поспехі, якіх дабіліся за мінулы год нашы спартсмены, асабліва ў секцыях лёгкай атлетыкі, гімнастыкі і стральбы, гавораць аб тым, што ва універсітэце масавасць спорту спалучаецца з чоткай арганізацыяй вучэбнага працэсу, круглагадзічнасцю заняткаў і значным узроўнем усебаковага фізічнага развіцця.

Па такіх відах спорту, як лыжы, футбол, баскетбол, валейбол, нягледзячы на іх вялікую папулярнасць сярод студэнтаў, спартыўнае майстэрства расло вельмі марудна. Гэта тлумачыцца тым, што ў секцыях пералічаных відаў спорту вучэбны працэс быў наладжаны слаба, без належнага кіраўніцтва з боку совета ДСТ «Навука» і адказных выкладчыкаў кафедры.

У гэтым годзе кафедра фізічнага выхавання і совет калектыва фізкультуры намеціл шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на далейшае разгортванне вучэбна-спартыўнай работы.

У сувязі з адкрыццём другой спартыўнай залы дадаткова для навічкоў будуць створаны секцыі валейбола, баскетбола, мастацкай гімнастыкі і фехтавання. Будуць працаваць таксама секцыі па вольнай барацьбе, штанзе, веласіпеднаму спорту. Значна расшыраюцца секцыі лёгкай атлетыкі, плавання, лыжная і секцыя спартыўнай гімнастыкі. Акрамя таго, будуць працаваць секцыі турызма, футбола, бокса, шахмат, стральбы і канькабежнага спорту. Усяго ў гэтым навучальным годзе заняткі будуць праходзіць у 45 вучэбна-трэніровачных групах па розных відах спорту.

У сучасны момант кафедра ўжо запрасіла для работы 20 выкладчыкаў-трэнераў, якія маюць вялікі спартыўны вопыт. Значную дапамогу ў развіцці спорту сярод студэнтаў нам павінны аказаць совет калектыва фізкультуры і факультэцкі спартыўны актыў. Неабходна правесці вялікую растлумачальную работу сярод студэнтаў, асабліва сярод першакурснікаў, расказаць ім аб спартыўных традыцыях універсітэта, дапамагчы выбраць найбольш падыходзячую секцыю. У рашэнні гэтай вялікай задачы мы чакаем дапамогі ад камітэта комсамола і прафкома, бо спартыўныя заняткі з'яўляюцца адным з лепшых відаў здаровага і культурнага адпачынку студэнтаў.

На працягу новага навучальнага года ва універсітэце будзе праведзена вялікая колькасць спартыўных мерапрыемстваў, у тым ліку круглагадовая спартакіяда па 11 відах спорту. Нашы зборныя каманды будуць абараняць спартыўны гонар універсітэта ў розных гарадскіх і рэспубліканскіх спаборніцтвах. Толькі на першае поўгоддзе намечана да 28 спаборніцтваў.

Пачэсны абавязак кожнага студэнта, кожнага комсамольца—знайсці сваё месца ў спартыўным калектыве універсітэта, павышаць спартыўнае майстэрства і ўмацоўваць спартыўную славу старэйшай навучальнай установы рэспублікі.

Е. МАРКАЎ,
загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.

Факты гавораць

(Па старонках часопіса „Молодёжь мира“)

АНГЛІЯ

Тэхнічны інстытут у Паддынгтоне размяшчаецца ў старой часоўні і закінутай багадзельні.

Палітэхнікум у Бардо, не гледзячы на-тое, што ён памяшчаецца, размешчаны ў начатковай школе, якая пабудавана ў XIX стагоддзі. Тры наверхі будынку прызнаны непрыгоднымі для правядзення вучэбных заняткаў.

Многія навучэнцы-рамеснікі ва ўзросце 16 год зарабляюць усяго 45 шылінгаў у тыдзень. Ім жывецца не лепш, чым калі-б яны вучыліся ў школе і атрымоўвалі заработак на выпадковай рабоце: прадажа, пераноска газет і г. д. Замест таго, каб у вольны час займацца спортам і весяліцца, гэтым юнакам прыходзіцца тры разы ў тыдзень наведваць вячэрнюю школу, для таго, каб авалодаць сваёй прафесіяй, якую яны навінны былі-б вывучаць у рабочы час.

ФРАНЦЫЯ

З 300 тысяч чалавек, якія закончылі пачатковую школу, толькі 70 тысяч (менш 25 працэнтаў) маюць магчымасць працягваць сваю адукацыю, 40 тысяч (13 працэнтаў) могуць атрымаць ніжэйшую спецыяльнасць, а 120 тысяч (40 працэнтаў) застаюцца без усякай спецыяльнасці.

З 118 школ прафесійнага навучання Нацыянальнага таварыства французскіх чыгунак, якія меліся ў 1945 годзе, у сучасны момант засталося толькі 88. У 1946 годзе ў гэтых школах навучалася 11080 чалавек, а зараз там засталося толькі 5000 навучаючыхся.

ІТАЛІЯ

У 1939 годзе курсы прафесійнага навучання наведвала 272 тысячы чалавек. Зараз гэты лік зменшыўся да 103240. Школы прафесійнага навучання задавальняюць толькі палавіну патрэбы ў кваліфікаваных рабочых. З 850 тысяч маладых беспрацоўных толькі 2,8 працэнта могуць працягваць заняткі на гэтых курсах.

ЗАХОДНЯЯ ГЕРМАНІЯ

У сучасны момант у Заходняй Германіі налічваецца 700 тысяч юнакоў і дзяўчат, якія не маюць магчымасці паступіць у школу прафесійнага навучання і, такім чынам, атрымаць кваліфікацыю. Па заканчэнні вучэбнага года лік юнакоў і дзяўчат, якія не змогуць атрымаць кваліфікацыю, разам з закончыўшымі школу, дасягне 1100 тысяч. Урадавыя ўлады тлумачаць гэтае палажэнне адсутнасцю сродкаў на будаўніцтва агульнаадукацыйных, тэхнічных і прафесійных школ. Аднак гэта не перашкаджае расходваць мільярды марак на падрыхтоўку да вайны і рэмілітарызацыю краіны.

Спартыўны план першага поўгоддзя

Кафедра фізкультуры і спорту сумесна з калектывам ДСТ «Навука» распрацавала план спартыўна-масавых мерапрыемстваў. У плане асабліва вялікае месца адводзіцца спаборніцтвам па розных відах спорту.

У канцы верасня зборныя каманды універсітэта па футболу, валейболу, лёгкай атлетыцы і баскетболу прымуць удзел у пяршынстве ВНУ горада Мінска.

З мэтай выяўлення лепшых спартсменаў для ўкамплектавання спартыўных секцый для студэнтаў першых курсаў будуць праведзены спаборніцтвы па ўсіх відах спорту. У гэтым-жа месяцы будзе праведзен традыцыйны агульнаўніверсітэцкі крос. Зборныя каманды універсітэта па фехтаванню і штанзе будуць удзельнічаць у пяршынстве Рэспубліканскага совета ДСТ «Навука».

Класіфікацыйныя спаборніцтвы па стралковаму спорту намечана правесці ў лістападзе. Акрамя гэтага, у снежні будзе праведзена пяршынство універсітэта па стральбе.

Зборныя каманды універсітэта па плаванню, шахматах і шашках прымуць удзел у пяршынстве Белсовета ДСТ «Навука». У канцы снежня будуць праведзены спаборніцтвы па лыжнаму спорту, прысвечаныя адкрыццю зімняга спартыўнага сезону. Лепшыя лыжнікі універсітэта будуць удзельнічаць у традыцыйнай гарадской эстафеце.

Рэдактар І. ХАЎРАТОВІЧ.

АТ 08576 Мінск, друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Зак. 576 Тыр. 1000